Hety numar „Chr. Dumki“ z dadatkam „ZORKA“

# CHRYŚCIJANSKAJA DUMKA

BIEŁARUSKI ČASAPIS — VYCHODZIĆ TRY RAZY U MIESIAC: 1, 10 i 20.

№ 26 (210) Vilnia, 1 vieraśnia 1939 h. — Wilno, 1 września 1939 r. Hod XII

# Sučasnaje mižnarodnaje pałažeńnie j biełaruskaja prablema

Mnohija z Biełarusaŭ, śledziačy za raźvićciom sučasnych eŭrapejskich mižnarodnych padziejaŭ, łoviać usialakija viestki, asabliva takija, što adnosiacca pasredna, abo biezpasredna da biełaruskaj spravy j vierać im navat tady, kali nia viedajuć skul hetyja viestki pachodziać i jakuju majuć metu. Usialakim hetkim viestkam, asabliva, što pieradajucca „šeptami ŭ vucha“ vieryć, i rabić nieadpaviednyja vyvady z zaisnavaŭšaj mižnarodnaj sytuacyi — niamožna.

Treba viedać, što sučasnaje razvićcio eŭrapejskich padziejaŭ — za jakimi śladzić i biełaruskaja presa — adbyvajecca z vialikim razmacham, na jakija małyja dziaržavy j niedziaržaŭnyja narody nia majuć nijakaha ŭpłyvu. Losy małych dziaržaŭ i niedziaržaŭnych narodaŭ rašajucca biaz ichniaha ŭčaścia j pamima ichniaj voli. Nichto ich nie zaprašaje na supolnyja narady j nichto z imi nie ŭkładaje nijakich palityčnych planaŭ. Biełarusy, jak i inšyja niedziaržaŭnyja narody, siarod tych dziaržaŭ, što ciapier „pieravaročvajuć“ śviet, ani sajuźnikaŭ, ani pryjacielaŭ nia majuć. Znachodziacca tolki adzinki pryjaznych dla nas ludziej — vučonyja, palityki, publicysty — ŭ roznych krajoch śvietu. Hetyja adzinki razumiejuć Biełarusaŭ i svaimi vystupleńniami robiać nam cennuju prysłuhu. Ale na vyrašeńnie našaha pałažeńnia jany niamajuć amal nijakaha ŭpłyvu.

Tyja, što ciapier kirujuć eŭrapejskaj palitykaj, majuć na ŭviecie tolki intaresy svaich dziaržaŭ. Hetyja dziejniki ŭkładajuć i vykonvajuć palityčnyja plany — plany nastupu j plany abarony — biez učaścia navat słabiejšych dziaržaŭ, nie biaručy zusim pad uvahu intaresaŭ niedziaržaŭnych narodaŭ, u hetym i intaresaŭ Biełaruskaha narodu.

Byŭ niadaŭna čas, kali šmat havaryli j pisali ab samaaznačeńni narodaŭ. Ale heta byŭ karotki čas — ad złučeńnia Aŭstryi z Niamieččynaj i pryłučeńnia Sudetaŭ da Vialikaj Niamieččyny, pakul apošniaja nie ŭziała pad protektorat Čechii. Paśla hetaha, pryncyp samaaznačeńnia narodaŭ, jak na ździek, adkinuli tyja, što jaho špiarša vysoka padymali. Na miesca samaaznačeńnia narodaŭ padniali novy pryncyp — žyćciovaha prastoru. Heta zusim źmianiła pałažeńnie niedziaržaŭnych narodaŭ u raźvićci mižnarodnych padziejaŭ u Eŭropie.

Pryncyp samaaznačeńnia narodaŭ pryznaje prava na žyćcio j svabodny razvoj kožnamu narodu, a „žyćciovy prastor“ — heta prava tolki silnym i vialikim.

Zdaŭna dasiul karystajucca biezhraničnymi abšarami „žyćciovaha prastoru“ Rasieja, jakaja zajmajučy šostuju čaść śvietu trymaje pad saboj mnoha narodaŭ u pałonie i Anhlija, što panuje na čaćviortaj čaści ŭsiaho śvietu. Na biezprykładnuju słavu Rasiei pracuje 180 miljonaŭ ludziej roznych nacyjanalnaściaŭ, a na mahutnaść Anhlii — 200 miljonaŭ tak-ža nacyjanalna roznaha narodu. Dyk voś ciapier hetyja impery — Rasieja j Anhlija — ŭsialakimi sposabami baroniać svaich „žyćciovych prastoraŭ“.

Niamieččyna ŭvažaje, što jana maje ŭsie dadzienyja stacca dziaržavaj roŭnaj z Anhlijaj i padzialić śviet na „žyćciovyja prastory“ pavodle zasłuhaŭ siły. Zhetul paŭstali plany palityčnaj pierabudovy Eŭropy j dziela asiahnieńnia hetaha jany pravodziacca. Tut nia idzie ani ab Hdansk, ani ab polskaje Pamorje — tut idzie ab spravu mnoha bolšuju j vielmi šyrokuju. Idzie zmahańnie za ŭładu, špiarša ŭ siaredniaj, a paśla i ŭ uschodniaj Eŭropie. Idzie baraćba za pavadyrstva ŭ Eŭropie ahułam.

Hetyja plany Niamieččyny znaje cely śviet. Pavinny ich znać i Biełarusy. U niamieckich planach jošć roznyja palityčnyja pahlady, ale pahladaŭ na biełaruskuju spravu tam znajści trudna. Dy j ahułam „biełaruskaha planu“ ŭ niamieckaj palitycy niama. Vyrašeńnie biełaruskaj prablemy vykłučaje z niamieckich palityčnych planaŭ i apošni fakt zakłučeńnia Niamieččynaj z SSSR paktu nieahresii. Słovam, u niamieckaj palitycy jošć plany tolki niamieckija.

Čamu SSSR dahavarvajecca z Niamieččynaj?

Treba viedać, što Savietam, u vypadku patreby, lahčej budzie baranić svajho „žyćciovaha prastoru“ — Ukrainy, Biełarusi j kaŭkaskich prastoraŭ ad pasiahańnia na ich z boku Niamieččyny biezpasredna, čymsia baranić jaho ad palityčnaha vyzvaleńnia Ukraincaŭ, Biełarusaŭ i Kaŭkascaŭ, adnačasna z abaronaj jaho ad Niamieččyny pasredna. Pry hetym SSSR maje ciapier i inšyja važnyja spravy svajej palityki. Zrazumiełaje tak-ža j stanovišča Anhlii, jakaja hetak rašuča supraćstavicca Niamieččynie. Anhlija, baroniačy intaresaŭ Polšcy j inšych dziaržaŭ, baronić pradusim svaje ŭłasnyja intaresy. Jana baicca stracić toje, što maje. Jana viedaje, što kali Niamieččyna ŭkrapicca ŭ Eŭropie, dyk tady jany spatkajucca ŭ baračbie za ŭładu nad śvietam.

Ciapier u roznych miascoch i na roznych dziaržaŭnych hranicach spatykajucca hetyja vialikija pali-

tyčnyja plany — plany nastupu i plany abarony. Ale ŭ hetaj vialikaj palitycy biełaruskaj spravy niama. Ani ŭ planach „nastupu", ani ŭ planach „abarony" prablema niedziaržaŭnych narodaŭ ahułam i biełaruskaja prablema ŭ asobnaści pakulšto nie rašajecca. Adnak nia vyklučajecca, što adna i druhaja starana chacieli-b vykarystać spravu niedziaržaŭnych narodaŭ, u hetym i spravu biełaruskuju, dla svaich asabistych intaresaŭ, bo taki ŭžo samalubny śviet. Dziela hetaha musimo być aściarožnymi, kab nia stacca pryładaj u čužych rukach dziela čužych nam intaresaŭ.

Hetak razhledziŭšy, — praŭda pavierchu, ale ŭsiestaronna—čužyja plany i čužyja intaresy bačym, što dla nas, Biełarusaŭ, jość adna daroha — mieć svoj, biełaruski plan i baranić svaich ułasnych intaresaŭ. Bo biełaruskaja sprava—heta tolki našaja sprava. Jana zaležyć ad nas samych, ad našaha rozumu i našaj pracy.

My nia raz pisali i ciapier prypaminajem usim Biełarusam, što nam pradusim treba vykonvać svaje narodnyja abaviazki ŭva usich halinach hramadzkaha žyćcia i jak zaklikaje B. N. A. — „trymajučy horda ściah svajej nacyjanalnaj biełaruskaj samastojnaj ideolohii, pašyrać u biełaruskich sialanskich i rabotnickich masach narodnuju śviedamaść, apirajučy jaje na nacyjanalnych i socyjalnych padstavach".

## Siamiejny kodeks u Francyi

Francyja, pačynajučy ad vialikaj svajej revalucyi, pavoli, ale stała raskładałasia maralna. Hałoŭnaj hetaha pryčynaj było toje, što revalucyja adkinuła Boha i chryścijanskuju etyku, a Francuski narod praz doŭhija hady ŭ hetym kirunku hadavaŭsia.

Vyniki takoha „vychavańnia" akazalisia hetkija. Žyvučy niemaralna, łamajučy zakony pryrodnyja i Božyja, Francuzy stalisia *biazpłodnymi*, pačali vyradžacca fizyčna.

Razam z biazpłodnaściaj „naturalnaj" pryjšła na Francuzaŭ tak-ža ***biazpłodnaść štučnaja***. Vydavać na śviet i hadavać dziaciej — heta śviaty i vialiki pryrodny i Božy abaviazak, ale nia mienš tak-ža i ciažki. A jak niama maralnaści, niama zrazumieńnia ŭsiaho hetaha, dyk niama i achvotnych hetyja abaviazki vykonvać. Francuzy śviedama pačali staranicca patomstva, stasujučy pry hetym roznyja prastupnyja i škodnyja srodki i sposaby. Abličana, što apošnimi hadami ŭ Francyi ŭ łonie matak zabivana dziaciej da paŭmiljona. Hetulki abličana, a skolki-ž nie abličana?

Apraća hetaha ŭ Francyi strašenna pašyrałasia *pornohrafija*, heta znača drukavańnie i pašyrańnie roznaha rodu niaprystojnych i biazstydnych knižak, hazet i abrazkoŭ. Francuski katalicki orhan „Temps Present" pisaŭ, što hetkaha rodu francuskaja litaratura absłužvała nia tolki rynak francuski, ale tak-ža ŭ vialikaj miery Anhliju, Italiju, Halandyju i inšyja krai.

Da hetych „krasačak" francuskaj maralnaści dałučajecca jašče *prastytucyja* (pradažnaść žančyn) i *pjanstva*. Praŭda, heta ŭsio možna spatkać i ŭ inšych krajoch, ale Francyja i pad hetym uzhladam da apošniaha času trymaje pieršaje miesca.

U vyniku hetaha ŭsiaho pryjšło na Francyju ***vyludnieńnie***. Jašče 50 hadoŭ tamu było tam pryrostu ŭ hod adzin miljon, krychu paźniej 600 tysiač, a ciapier z hetym užo susim drenna. Tak napr. u 1925 h. užo ścvierdžana, što śmiarotnaść bolšaja, jak naradziny. Apošnim časam štohodu ŭ Francyi lik nasielnictva źmianšajecca bolš-mienš na 35 tysiač asob u hod. Znača, narod jaŭna jdzie da śmierci.

Lepšyja i razumniejšyja Francuzy spaścierahli heta daŭno i rabili ŭsio mahčymaje, kab u paru praciŭstavicca hroznaj niebiaśpiecy. Pačaŭsia vialiki ruch chryści

АД. СТАНКЕВІЧ

## ХРЫСЬЦІЯНСТВА І БЕЛАРУСКІ НАРОД [25]

*(У 950-ыя ўгодкі Хросту Беларусі: 988/9—1938/9)*

Быў гэта ў значнай меры кар'ерыст і заблудзіўшы самалюб, які калі і ўспамінаў аб патрэбе ў жыцьці касьцельным мовы беларускай і калі й сам гэтай мовай гаварыў, дык, судзячы з яго супрацоўніцтва з урадам, была гэта толькі тактыка, часовы русыфікатарскі манэўр, які нядвузначна імкнуўся да ўвядзеньня ў жыцьцё рэлігійнае каталікоў Беларусаў мовы не беларускай, а расейскай.

Санчыкоўскі — паслушнае аружжа русыфікацыі Беларусі ў руках расейскага ўраду. Дапамагалі яму стаць на гэту дарогу тагочасныя палітычна-грамадзкія варункі на Беларусі. У значнай меры Санчыкоўскі — дзіця трагедыі свайго часу.

Аднак, ня гледзячы на схаваныя пляны ў працы Санчыкоўскага што да мовы ў касьцеле, няма падстаў ня верыць яму, што як ён сам, так і многія іншыя ксяндзы ў ліку 46, як ён кажа, у ваднэй толькі Менскай дыэцэзіі, сапраўды шмат дзе карысталіся ў казаньнях да каталікоў Беларусаў мовай беларускай. Трэба такжа думаць, што вышэйшая духоўная ўлада, калі сапраўды бачыла ўжываньне тады ў касьцёлах мовы беларускай, мовы роднай народу, а не расейскай, гэтаму прынамсі афіцыяльна не працівілася, як не працівіўся гэтаму, а нават радзіў, Магілёўскі Арцыбіскуп Сымон.

Тым больш праўдападобныя цьверджаньні аб мове беларускай у касьцеле Санчыкоўскага, бо і ў архіве канцэлярыі Віленскага Генэрал-Губэрнатарства (1867—70) ёсьць сьпісы ксяндзоў, гаворачых па касьцёлах беларускія казаньні.

Але найлепшымі гэтага довадамі служаць дакументы. Затрымаемся тут над імі бліжэй. Кс. праф. Ал. Навіцкі (Латвія) ў сваім часе перадаў Бел. Каталіцкаму Выдавецтву ў Вільні рукапісныя беларускія каталіцкія казаньні.

У гэным рукапісе спатыкаем чатыры казаньні ў чатырох сшытках, пісаныя на палавіне канцэлярыйнага аркуша на абедзьвюх бачынах

janski, jak asabisty, tak i hramadzki, značny pavarot da kaścioła, raźviccio francuskaj nacyjanalnaj i katalickaj dumki, pajavilisia chryścijanskija piśmieńniki, paety, vučonyja, katalickaja j nacyjanalnaja litaratura j h. d. Adnak papravy samaha balučaha miesca vidacca nia było.

Urešcie pad hetym uzhladam lepšaj častcy francuskaha hramadzianstva z pomačaj pryjšła sama dziaržava: Prezydent dekretam vydaŭ tak zv. „siamiejny kodeks", jaki składajecca z 412 artykułaŭ i datyča maralnaha j fizyčnaha zdaroŭja, jak siamji, tak i ŭsiaho Francuskaha narodu. Duch hetaha kodeksu ŭ hałoŭnych svaich pad stavach chryścijanski j ničoha ŭ im niama ani rasistoŭskaha, ani fašystaŭskaha.

Zakon hety biare pad uvahu ŭsie vyličanyja maralnyja słabaści Francuskaha narodu j starajecca ich zapabiehčy, za złamańnie jakich stasujučy navat vialikija kary. Tak napr. tyja, što dakonvajuć niedazvolenyja praktyki na žančynach, karajucca vastroham ad 5 da 10 hadoŭ i vysokim hrašovym štrafam, a samyja žančyny, što hetym praktykam paddajucca, karajucca vastroham ad hodu da piaci. Usim-ža płodnym siemjam dajucca roznyja pryvilei j hrašovyja dapamohi.

Viedama, sam zakon tut jašče ničoha nie paradzie, što pryznaje j sam heny kodeks, ale jon stvaraje naležnuju atmasferu i jość salidnym i vialikim pačatkam maralnaha j nacyjanalnaha azdaraŭleńnia Francuskaha narodu.

I Biełarusy pavinny viedać, što zdarovaja, na chryścijanskich asnovach apiortaja siamja, — heta najhałaŭniejšaja apora pamyснaści adzinak i narodaŭ. Biełarusy ab hetym pavinny viedać i adpaviedna da hetaha viedańnia pastupać.

A. S—ki

*Z biełaruskich hazet*

# „Моладзь і праблема будучыні"

Пад гэткім загалоўкам *„Шлях Моладзі"* (з 25.VIII.1939) друкуе цікавы артыкул ведамага беларускага паэта *М. Васілька,* аб благіх нахілах некаторай часткі нашай вясковай моладзі. Галоўную частку таго артыкулу перадрукоўваем, каб шырэй зьвярнуць увагу беларускага грамадзянства на разрастаючу благату ў нашай моладзі. М. Васілёк піша:

—Прыкра, але трэба сказаць, што моладзь наша па вёсках і мястэчках, новае падрастаючае пакаленьне, а частка й старэйшага, якую яшчэ захапіў так хутка расквітаўшы, а нядаўна зьліквідаваны бел. культурна-асьветны рух, — гэта моладзь пачынае дэмаралізавацца, прасьцей кажучы — дзічэць. Сяньня гэтае зьявішча можна знайсьці амаль у кожнай вёсцы. Нажы, гіры, гумы і ім падобныя „рыцарскія" прылады, ненавісьць, дзікая, безразсудная буйнасьць, п'янства, брыдкія лаянкі — вось „красачкі", што ўквечваюць нашую моладзь. Адбываюцца вечарыны, на якія па традыцыі прыходзіць моладзь з розных ваколіц, толькі калісь моладзь ішла на вечарыну з голымі рукамі, з добрымі намерамі, пазнаёміцца, правясьці весела час, адпачыць духова, ішла ў агульную юнацкую сям'ю з сьветлымі думкамі прыязьні й дружбы, а сяньня йдзе на вечарыну, ці то ў сваю, ці то ў чужую вёску ўзброеная да зубоў — з гірамі ў кішані, з нажамі ў халявах, з каменем за пазухай, а ў душы поўна жоўці раз'ранага зьвяра. І такое зьявішча становіцца нечым вабячым, нечым модным. Зьдзічэньне даходзіць на'т на таго, што тыя адзінкі, якія яшчэ верна й чэсна нясуць свой юнацкі горды сьцяг барацьбы з усебаковымі праявамі грамадзкага зла, барацьбы за лепшае, сонечнае заўтра, тая

---

У адным сшытку, на 64-ох бачынах памешчана навука на 17-ую нядзелю па Зялёных Сьвятках. На першай бачыне зазначана, што навука гэта гаворана была ў 1860 і 4 г. у Посіне, 1863 г. у Лянцкороне, 1868 г. у Савэйках, 1870 і 1872 г. у Ульле.

Другі сшыток на 72-ох бачынах зьмяшчае казаньне на дзень Непавіннага Зачацьця Найсьвяцейшай Дзевы Марыі. Гаворана яно, як відаць з зацемак так-жа на першай бачыне: 1865 і 1867 г. у Лянцкороне, 1871 і 1872 г. у Ульле.

У трэцім сшытку на 40 бачынах напісана казаньне на ўрачыстасьць Божага Цела, гаворана 1861 і 1863 г. у Посіне, 1866 і 1869 г. у Лянцкороне і ў Савэйках, 1870 і 1872 г. у Ульле.

Чацьверты сшыток становіць казаньне на Дзень Задушны, напісанае на 32 бачынах і гаворана ў 1862 г. у Посіне, 1868 г. у Лянцкороне, у 1870 і 1872 г. у Ульле.

Усе гэныя меснасьці знаходзяцца ў былўшай Віцебскай губэрні. Вылічаныя гады, меснасьці й дні, калі якое казаньне было гаворана, надпісаны папольску, як відаць з пісьма, пазьней, але тэй самай рукой, што й самыя казаньні.

Цытаты з Сьвятога Пісаньня, з Айцоў Касьцёла, ці якія іншыя, паданы так-жа папольску. Рэшта ўсё пісана пабеларуску.

Як бачым, былі ў Каталіцкім Касьцеле на беларускіх землях праўдзівыя пастыры, якія і ў гэныя цяжкія гады, патрапілі быць блізка да народу й карыстацца яго мовай у сьвятынях.

Патрэбу карыстаньня роднай мовай у Касьцеле разумела няраз тады так-жа й вышэйшае каталіцкае духавенства. Так, напрыклад, калі пад канец XIX ст. барацьба царскіх урадаў з польскай мовай па касьцёлах дужа завастрылася, Магілёўскі каталіцкі арцыбіскуп Сымон запрапанаваў ураду згадзіцца завесьці ў Касьцёл у беларускіх парахвіях, замест расейскай, мову беларускую, мову родную народу. З прычыны гэтай прапановы пачалася перапіска між урадам і Апостальскай Сталіцай. У выніку гэтай перапіскі папескі сакратар кардынал Рамполья, ад імя папежа Лявона XIII, паведаміў арцыбіскупа (ужо Казлоўскага), што Апостальская Сталіца дае яму права дазволіць пробашчам карыстацца ў казаньнях мовай беларускай там, дзе карыстаецца гэтай мовай народ. Да-

частка моладзі, якая ня гледзячы на ўсякія нявыгоды, усё-ж цьвёрда й сьведама йдзе да свае мэты, выконваючы вялікія заданьні, — ведаю, ёсьць такія мясцовасьці, дзе гэтая здаровая частка моладзі спатыкаецца з байкотам і з рознымі прыкрасьцямі з боку розных дзікуноў і асоб нясьведамых. Зьявішча прыкрае, балючае, якое трэба рашуча зьліквідаваць. Спадзяюся, што пры агульных культурных натугах, хоць паступова, але зьнікнуць чартапалохі і ўсякі бруд, што засьмечвае сёньня нашу юнацкую ніву. Спадзяюся, бо маю ў душы перакананьне, бо ведаю, што не радзіліся й гэныя людзі, што ходзяць з нажамі й каламі, з гэткімі брыдкімі задаткамі характару. Віна тут вялікая прадусім у тых вонкавых абставінах, якія нас акружаюць і якія ня спрыяюць беларускай культурнай і асьветнай працы. Моладзь — гэта запал, гэта сіла, імпат, які мусіць выладавацца ў адпаведным, добрым кірунку.

Як выйсьці з жудаснага палажэньня нашага маладога пакаленьня? — Пытаньне гэтае пакідаю адкрытым. Зазначу ад сябе, што наша сьведамая моладзь, якая па вёсках і мястэчках вядзе барацьбу за сьвятло, за навуку, за паляпшэньне свайго сацыяльнага быту, за ўсьведамленьне нацыянальнае, — мусіць аб'явіць і праводзіць становучую барацьбу з п'янствам, разбоямі й іншымі брыдкімі й шкоднымі зьявішчамі нашага народнага арганізму.

Заклікаю аднача сна нашую маладую інтэлігенцыю, нашых студэнтаў, гімназістаў, якія ўлетку і ў часе сьвяточных канікулаў маюць магчымасьць беспасярэдна спаткацца з вясковай моладзяй, — ладзіць лекцыі, навязваць гутаркі, рабіць усё магчымае, што прычынілася-б да падняцьця маральнага ўзроўня моладзі,да падняцьця культурнага развою сваіх зблудзіўшыхбратоў.

Заклікаю нашых маладых паэтаў і пісьменьнікаў да барацьбы з гэтай пошасьцю жывым, мастацкім словам.

Трэба біць крытыкай, кляйміць ганьбай тых „рыцараў" цёмнай ночы, якія ў нашыя часы вялікіх зьменаў і сусьветных падзеяў дэмаралізуюць рады сваіх маладых братоў, лезуць сьведама ці нясьведама ў процьму разбояў п'янства й усялякіх брыдотаў.

Зьвяртаюся й да тэй часткі моладзі, каторую можна назваць „пасывам". Яна сьведамая, праўда, яна можа быць нават прыкладам у жыцьці, але-ж глядзець на ўсе выбрыкі дзікуноў моўчкі, быццам паказваючы, што вось, маўляў — добра, што хоць яна не такая... Не, гэтага мала! Трэба ўсім перамагаць нашае супольнае грамадзкае зло!

Многа ёсьць хваробаў, але-ж ёсьць на іх і лекі. Я перакананы, што й гэтая хвароба нашае моладзі паступова паддасца, мусіць паддацца лячэньню.

## U Ukraincaŭ

**Z pastanovaŭ U.N.D.O.** Nacyjanalny Kamitet Ukrainskaha Demakratyčnaha Abjednańnia 24 žniŭnia siol. na sabrańni ŭ Lvovie pryniaŭ pastanovy, u jakich, miž inšym, zvaročvaje ŭvahu na nastupnaje:

Sučasnaje mižnarodnaje pałažeńnie dajšło da najvyšejšaha napiaćcia i ŭ kožnuju chvilinu hrazić vajennym vybucham. U hetkim histaryčnym mamencie Ukrainski narod musić imknucca da ŭtvareńnia abjednanaha nacyjanalnaha kiraŭnictva. Niachaj ani adzin Ukrainiec nie paŭstaje prociŭ druhoha! Niachaj ani adna ŭkrainskaja arhanizacyja nie vystupaje prociŭ inšaj! Treba ŭ našym, ukrainskim unutranym žyćci stvaryć adnalituju maralnuju siłu. Ciapier niama nijakaj čužoj siły, jakaja-b mieła na ŭviecie vyrašeńnie ŭkrainskaj palityčnaj prablemy. A taja prapahanda, što nahavarvaje čakać pastaronnaj pomačy, nia jość zhodna z patrebami Ukrainskaha narodu.

---

кумэнт гэты падпісаны 8.V.1897 г. за № 37,522.

Праўда, з найвышэйшага гэтага дазволу мусіць мала хто скарыстаў, бо арцыбіскуп Казлоўскі з аднаго боку, баючыся русыфікацыі й Праваслаўя, а з другога — рахуючыся з напорам польскага грамадзянства й духавенства, якое агулам стаяла толькі за мову польскую ў Касьцеле, не дапускаючы туды ані мовы беларускай, ані літоўскай, у жыцьцё гэнага дазволу Апостальскай Сталіцы ня ўвёў.

Аднак дакумэнт гэты мае для нас вялікае значэньне. Ён яшчэ раз, ужо лішні раз, сьцьвярджае тую праўду, што адносіны сьв. Айца да кожнага народу—гэта адносіны сапраўды бацькаўскія, што кожная мова мае поўнае права ў каталіцкай сьвятыні й што калі дзе да гэтага не даходзе, дык гэта дзеецца з прычын пераважна палітычных, з прычын цалком незалежных ад Апост. Сталіцы.

Але маемо яшчэ так-жа падставу цьвердзіць, што і ў апошнім дзесятку XIX ст. і па ім, беларускія казаньні дзе-ня-дзе па каталіцкіх касьцёлах Беларусі былі гавораны. Цьвердзе аб гэтым Д. Н. Чіхачэв у сваей кніжцы: «Вопрос располяченія Костёла», а ўрэшце аб гэтым у беларускім народзе ёсьць яшчэ жывыя традыцыі. Так, напрыклад, старэйшыя ксяндзы Магілёўскай дыэцэзіі расказваюць, што ў канцы XIX ст. і аж да часу выбуху сусьветнай вайны, у некаторых парахвіях беларускіх агулам, асабліва-ж Віцебшчыны й Магілёўшчыны ўсьцяж гаварыліся беларускія казаньні.

Ведамы адзін з піонэраў беларускага руху кс. Фр. Будзька († 1920), з Магілёўскай дыэцэзіі, які быў дужа блізка да Магілёўскага біскупа Данісэвіча, Беларуса, — расказаваў мне, што казаньні беларускія й песьні рэлігійныя беларускія былі ў Ульле (Віцебшчына), у Фашчоўцы (Магілёўшчына) і ў іншых мясцох Беларусі аж да апошніх дзён.

Гэта былі адны, казаў-бы, з ручайкоў, якія несьлі на сваіх немногаводных фалях нашу мову з касьцельнага зацішша ў шырокія воды беларускага адраджэньня XX-га ст.

Словам, у найцяжэйшы час для беларускай нацыянальнасьці, адзінай апорай яе аказалася усёжтакі Хрысьціянства. Агулам, Хрысьціянства па сваей натуры ёсьць такім, аб якім трэба

## Biełarusy—sialanski narod

Daŭniej mieraj kulturnaści narodu byŭ lik miaščanskaha nasielnictva. Čym bolš mieŭ jaki narod haradzkich žycharoŭ, tym jon uvažaŭsia kulturniejšym. Bo heta aznačała, što tam lepš raźvity promysieł, handal i toj narod maje najnaviejšyja zdabyčy techniki. Na sialan tady nie zvaročvali ŭvahi j siało było ŭ pahardzie.

Ciapier pavoli, ale pastupova prychodzić čas siała j sialanstva. Sialanstva — heta fundament narodu, ćvierdziać navukoŭcy. Bo što z taho, što niejki narod jość kulturny, kali jaho fundament słaby j razvalvajecca? Što tady z tych fabrykaŭ i inšaha bahaćcia, kali sam narod vymiraje? Dyk i ničoha dziŭnaha, što ciapier pačynajuć mierać siłu narodaŭ užo inšaj mierkaj. Ciapier uvažajecca silniejšym toj narod, jaki bolš žyćciazdolny, a nia toj, što jość najkulturniejšy. Daŭniej my stydalisia, što naš, Biełaruski narod jość narodam sialanskim. Ciapier usim jasna, što Biełaruski narod, jaki maje ŭ svajej całaści 90 proc. zdarovaha sialanstva, moža mieć prad saboj zapeŭnienuju lepšuju budučyniu.

My bačym, kolki Niemcy ciapier kładuć siły, kab adradzić svajo sialanstva j bačym, jak heta im trudna dajecca. Bo z mieščanina trudna zrabić sielanina.

## Vysielańnie Biełarusaŭ z Savieckaj Biełarusi

Hazety padajuć, što Saviecki ŭrad śpiešna pravodzić kalonizacyju na Dalokim Uschodzie. Hetaj kolonizacyjaj balšaviki vysielajuć z rodnaha kraju Biełarusaŭ i Ukraincaŭ, zasialajučy imi pustyry Dalokaha Ŭschodu.

Apošnimi časami adpraŭlena z Biełarusi i Ukrainy na Daloki Ŭschod až niekalka transportaŭ sialanskich siemjaŭ.

---

Biełaruskaje sialanstva, vyprabavanaje žorstkaj minuŭščynaj, zdało ekzamin stojkaści j vytryvałaści. Pamiorła dla narodu biełaruskaja šlachta, zamiorła biełaruskaje miaščanstva, a sialanstva hetuju zmoru pratryvała j pierachavała ŭsie skarby svajho narodu — biełaruskuju tradycyju, zvyčai j ahułam duchovuju kulturu staroj Biełarusi, z jakoj ciapier razrastajecca novaja Biełaruś. Ale ci našaje sialanstva ŭžo dastatačna pryhatavana da śviedamaj nacyjanalnaj pracy? Treba pryznacca, što nie!

Dyk voś ciapier hałoŭnaj zadačaj biełaruskaj maładoj intelihiencyi, jakaja ŭzhadavałasia na pierachavanych sialanstvam narodnych skarbach, spłacić svoj doŭh sialanstvu j pryhatavać jaho da śviedamaj nacyjanalnaj pracy.

p—k

## Muzyka ŭ litoŭskaj dziaržavie

Pad hetkim zahałoŭkam viedamy vilenski kampazytar K. Hałkoŭski źmiaściŭ u litoŭskaj vilenskaj hazecie „Aidas" (№ 90) vialiki j cikavy artykuł. Padajom tut jaho ŭ skaročańni.

— Usich rodaŭ muzyka raźvivajecca ŭ Litvie j robić postupy. Dziaržaŭnaja Opera, balet, symfoničnyja kancerty, a tak-ža viečary kameralnaj muzyki pracujuć biezpraryŭna. Dziaržava ŭsie hetyja kulturnyja ŭstanovy dahladaje j imi apiakujecca. Konservatoryja j muzyčnyja škoły značna raźvilisia. Pionery pieśni pracujuć u svajej halinie j majuć duža dobryja varunki, patrebnyja mastakom, kab jany płodna mahli pracavać.

Prad vajnoj u Koŭnie litoŭskaja muzyka miełasia duža drenna. Dziela hetaha nie stvaryła jana tady svaich tradycyjaŭ i ŭ niez. Litvie ŭsio treba było pačynać spačatku. Pieršaj spravaj u halinie muzyki ŭ niez. Litvie była Dziaržaŭnaja Opera. Kaštavała jana dziaržavie vializarnyja hrošy. Ale Opery budynak, choć niaraz papraŭlany j pierarablany, usio-ž usim vymoham opery nie adpaviadaje i ŭrad u chutkim časie prystupić da budavańnia novaha.

Opera maje ŭłasny chor likam 30 čałaviek. Opera vyjaždžaje tak-

---

сказаць наступнае. Ня гледзячы на тое, ці яно польскае ці расейскае ў значэньні палітычным, у значэньні той чужой мовы, якой яно змушана да Беларусаў прамаўляць і ня гледзячы на тыя чужыя народу тэндэнцыі, якія яго часта змушана праводзіць, — усёжтыкі ў некаторай меры неперастае быць апорай беларускай нацыі й сродкам яе консолідацыі й супольнасьці. А гэта затым на маю думку, што вобак з чужымі ідэямі й чужой мовай яно выробляе й закрапляе праз блізкія між верным, сардэчныя духовыя суадносіны, адзінства, блізкасьць, сваяцтва, а так-жа асьвячае гэта павагай Божай. Чужая афіцыяльна форма так афіцыяльнай і астаецца, а гэная блізкасьць, гэныя традыцыі, гэная ўзаемная супольнасьць і адзінства самі праз сябе народ консолідуюць і надаюць яму беларускі нацыянальны стыль. Ведама, гэткага характару творывам беларускай нацыянальнасьці ня можа мець ніякая іншая сьвецкая грамадзкая ўстанова.

Калі прыйшоў аканчальны заняпад Беларускага народу: заняпад палітычны й культуральны, як на дзіва — прыйшло й адраджэньне. Да зярнятак апоры беларускай нацыянальнасьці безпасрэдна хрысьціянскай, далучыліся пасрэдныя — романтызм. На пачатку XIX ст. ў Эўроне романтызм пачаў новую эру людзкой думкі. У палавіне гэтага ст, рамантызм дакаціўся й да Беларусі. Сутнасьць яго ў тым, што запладняць людзкую думку ў галіне літаратуры, а так-жа й грамадзкага жыцьця пачало пачуцьцё, мінуўшчына, нацыянальнасьць. Ідэалы гэтыя заактуалізавала француская рэвалюцыя, а жаўнеры Наполеона разьнесьлі іх па ўсей Эўропе. Такім чынам дайшлі яны й да Беларусі. А сутнасьць рамантызму як-жа многа мае супольнага з Хрысьціянствам!

Урэшце ручайкі беларускага хрысьціянскага нац. адраджэньня зьліліса з агульным ручём і сталіся ракой сучаснага агульнага беларускага нацыянальнага руху. Хрысьціянства такім чынам сваю адвечную роль адносна бел. нацыі споўніла. Спаўняе яе, як убачым, і сяньня.

(Літаратура: **Abraham i Fiołek** (як у разьдзеле XI); **Ks. Ad. Stankevič** — Rodnaja mova ŭ śviatyniach; **В. Ластоўскі** — Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі).

ža j na pravincyju: u Paniavież, Šaŭli, Taurogi.

Pamysna tak-ža raźvivajecca dziaržaŭny balet i symfoničnyja kancerty. Balet składajecca z 30 asob. U sezonie adbyvajecca 5—8 symfoničnych kancertaŭ, u jakich časam prymaje ŭdzieł čałaviek sto.

Zasłuhoŭvajuć na ŭvahu ŭ Litvie tak-ža chory. Z hetych najvažniejšyja: universytecki (200 čałaviek), šaŭleŭski (150 čałaviek), chor maładych litoŭcaŭ (100 čałaviek) i kaścielny vajenny (60 čałaviek). Niamała jošć tak-ža dobrych choraŭ i na pravincyi.

Časta naładžvajecca śviata pieśni j muzyčnyja festivali.

Pavažna pastaŭlena muzyka ŭ himnazijach, dzie da klasy piataj prachodzicca teoryja muzyki, a ad piataj — praktyka.

U Koŭnie vychodzie muzyčny miesiačnik „Muzikos barai“, jaki duža pryhoža redahujecca j jošć tak-ža niamała specyjalistaŭ muzyčnych krytykaŭ.

Ahułam treba skazać, što ŭ Litvie na pieśniu j muzyku zvaračvajecca naležnaja ŭvaha j što tam pieśnia j muzyka ŭ narodnym žyćci zajmaje pavažnaje miesca. — *T. S.*

**Baćki Biełarusy! Vučycie svaich dziaciej čytać i pisać pabiełarusku!**

# Dahavor Niamieččyny z SSSR ab uzajemnym nienapadańni

Suadnosiny Niamieččyny z SSSR z varožych raptoŭna źmianilisia na pryjaznyja. Dnia 23 žniŭnia 1939 h. hetyja vialikadziaržavy zaklučyli pakt nieahresii. Dahavor padpisany ŭ Maskvie: z boku Niamieččyny praz ministra zahraničnych spraŭ Rybentropa, a z boku SSSR—kamisara Mołatava. Hetym dahavoram Niamieččyna j SSSR zabaviazalisia žyć mirna, adrakajučysia vyrašać miž saboj usialakija spory vajnoj indyvidualna i supolna z inšymi vialikadziaržavami. Kali-b Niamieččyna, abo SSSR, pačali vajavać z inšymi dziaržavami, dyk Niamieččyna nia budzie pamahać voraham SSSR, a SSSR—voraham Niamieččyny. Usialakija spory miž Niamieččynaj i SSSR majuć vyrašacca tolki miralubna, šlacham uzajemnaha dahavoru, abo paluboŭnaha sudu. Hetak mirna žyć abiedźvie vialikadziaržavy zabaviazalisia praz 10 hadoŭ, a kali ni adna z staron, za hod prad terminam nie adkažacca pradoŭžyć dahavoru na dalej, dyk hety dahavor aŭtomatyčna budzie abaviazyvać Niamieččynu j SSSR jašče praz 5 hadoŭ.

## Saviecka-niamiecki handlovy dahavor

Adnačasna z palityčnym dahavoram ab mirnym sužyćci, Niamieččyna zaklučyła z SSSR i handlovy dahavor. Pavodle hetaha dahavoru, Saviety daduć Niamieččynie ŭsialakich tavaraŭ i praduktaŭ na sumu 180 miljonaŭ marak, a Niamieččyna pradaść Savietam svaich mašynaŭ i ŭsialakich pramysłovych vyrabaŭ na sumu 200 miljonaŭ marak.

Hety dahavor, treba śćvierdzić, u značnaj miery ŭzmacniaje saviecka-niamiecki pakt nieahresii, što daje padstavu sudzić ab ščyraści zhody Niamieččyny z SSSR.

## Palityčnaje značeńnie zhody Niamieččyny z SSSR

Zhoda Niamieččyny z SSSR u mižnarodnaj palitycy maje vializarnaje značeńnie. Pradusim, hety fakt kasuje ŭsie plany Anhlii, što Saviety mohuć stanuć u bloku dziaržaŭ „abarony miru“, dziela spynieńnia niamiecka-italjanskich damahańniaŭ palityčnaj pierabudovy siaredinia-ŭschodniaj Eŭropy.

Dr. Jadviha i Stanisłaŭ Hrynkievičy (11

# Vospa j pryščepy vospy

Na hetym miejscy treba było-b jašče abhavaryć pryščepy dziacie ad nikatorych zaraznych chvarobaŭ, jakija vielmi časta davodziać da śmierci, a prynamsia pakidajuć pa sabie nazaŭsiody śledamki, a ad jakich lohka vylekavacca, kali na paru padumać i zabiazpiečycca. Najvažniejšaju hetakaju chvarobaju j budzie **vospa.**

Chvaroba henaja pryšła da nas z Azii j chutka razyšłasia pamiž usimi narodami Eŭropy. Vielmi častyja byli epidemii, jakija zabirali mnostva achviaraŭ z saboju. I tolki tady, kali anhielski lekar *Edvard Jenner* prydumaŭ pryščaplać ludziam vospu, chvaroba henaja pierastała być niebiaśpiečnaju, a ŭ tych staronkach, dzie jošć prymus pryščepaŭ, vospa nia vystupaje epidemična.

Daŭniej užo viaskovyja ludzi viedali, što adzinki, jakija zajmaliś dajeńniem karovaŭ ci ahułam dahladali za karovami, redka chvareli na vospu. Jenner, abmiarkavaŭšy ŭsieńka dobra, dajšoŭ da vyvadu, što jošć niešta supolnaje pamiž tym, što nikatoryja ludzi nie chvarejuć na vospu dy tym, što henyja ludzi časta sustrakajucca z „karostavatymi“ karovami. Dyk voś jon pryščapiŭ pieršy raz chvoramu dziciaci vospu ad hetkaje „karostavataje“ karovy.

**Vospa** ŭ ludziej pačynajecca trascaju j vysokaju haračkaju, jakaja trymajecca 3—4 dni. Na 4-ty dzień chvaroby pakazvajecca na ciele chvoraha *vy sypka* — napierad na tvary, potym byccam razychodzicca na ŭsio cieła, na ruki, nohi. Vysypka henaja moža abniać i *sklizistyja pavałoki* hubnoje padzi, nosa, horła, harlaka, a nat dychnicy j dychałaŭ (bronchaŭ). Na vysypcy chutka pajaŭlajucca *punkciki,* ŭ jakich znachodzicca prazrystaja *cieča.* Punkciki henyja što raz *bolšajuć* i robiacca *puzyrkami,* jakija majuć usiaredzinie pupkavatyja *ŭhłybleńni.* Cieča ŭ puzyrkach mutnieje j pieramianiajecca na materyju. Puzyrki vyhladajuć tady niejak papeckanymi, kolaru žoŭtavata-zialonaha.

Pieramiena henaja robicca kala *9-ha* dnia chvaroby. Na *11-ty* dzień karosty pačynajuć zasychać i chvoraje miesca chavajecca pad strupami, jakija doŭha nia trymajucca j adpadajuć. Na henuju paru chvoryja nadta strašna vyhladajuć, majuć jany adnačasna niaznosnyja boli ad napružańnia skury, a asabliva balučymi buduć karosty na jazyku i ŭ horle dy na sklizistych pavałokach vočaŭ. Na henuju paru moža padniacca znoŭ temperatura. Henaja para jak ha j budzie najbolš *niebiaśpiečnaju* dziela zdaroŭja, a nat i dziela žyćcia chvoraha. Kali nia pryduć kamplikacyi, dyk ludzi zdaraviejuć i pačynajučy ad 18-ha dnia chvaroby pastupienna jdzie pavarot da zdaroŭja. Strupy adpadajuć, pakidajučy nažal pa sabie *rubcy* na ŭsio žyćcio.

Pry mienš ščaślivych umovach chvaroba kančajecca śmiarotna z nahody ahulnaha, nadta silnaha abniadužańnia pry henaj chvarobie, zakažeńnia kry-

Z druhoj starany, — hetaja zhoda razvalvaje „antykamunistyčny“ sajuz Niamieččyny z Japonijaj. Dalej —kamunizmu, jaki reprezentuje ŭ śviecie SSSR, akančalna adbiraje davier u masach, u spravie baraćby z fašyzmam, a niamieckamu nacyjanalizmu paraližuje baraćbu z kamunizmam pa-zahranicami Niamieččyny. Słovam, sprava stavicca tak, što kamunizm — heta sprava tolki imperyi SSSR, a niamiecki nacyjanalizm—sprava intaresaŭ Niamieččyny.

# Pahroza vajny j sproby ratavańnia miru

Palityčnaje napružańnia ŭ Eŭropie dachodzić da najsilniejšaha napiaćcia. Uzryŭ moža nastupić u kožnuju chvilinu. Amal usie eŭrapejskija dziaržavy zmabilizavali svaje zbrojnyja siły j pastavili całuju Eŭropu na pahatovie z strelbaj u rukach. Haloŭnym punktam hetaha napiaćcia źjaŭlajecca niamiecka-polskaje pahraničča. Nastup Niamieččyny, jaki byccam łahadniejе ŭ inšych punktach, pastaviŭ Polšč na hatoŭnaści da abarony svajej niezaležnaści.

## Zaklik św. Ajca da miru

Papa Pius XII.24 žniŭnia siol. skazaŭ praz radyjo pramovu, u jakoj narysavaŭšy abraz ciapierašniaha hroznaha pałažeńnia dla čałaviectva, skiravaŭ svoj zaklik da kiraŭnikoŭ dziaržaŭ i naradaŭ, zvaračvajučy ŭvahu, što spraviadlivaść asiahajecca tolki siłaj razsudku, a nie siłaj zbroi. Św. Ajciec adznačyŭ, što niebiaśpieka ŭžo blizka, ale jašče ŭścierahčysia vajny možna. Niachaj pačnucca pierahavory j niachaj adbyvajucca jany z dobrym namieram, dyk jasna stanie, što j biez vajny jość mahčymaść vyrašać spornyja spravy.

## Zvarot prezydenta Ruzvelta da Polščy j Niamieščyny

Prezydent Zł. Št. Paŭnočn. Ameryki Ruzvelt 25 žniŭnia siol. źviarnuŭsia telehramaj da prezydenta Polščy praf. I. Maścickaha j kanclera Niamieččyny Adolfa Hitlera, jakoj zaklikaje abiedźvie dziaržavy—Polšč i Niamieččynu—da ŭstrymańnia varožaj dziejnaści j vyrašeńnia sporu paluboŭna.

Prezydent Maścicki adkazaŭ prezydentu Ruzveltu, što Polšč staić za pašanavańnie mižnarodnych dahavoraŭ i ŭvažaje za najlepšy sposab vyrašańnia ŭsiałakich sporaŭ biez vajny. Adkaz Hitlera dakładna niaviedamy.

# Sajuz Anhlii z Polščaj

Miž Anhlijaj i Polščaj 25 žniŭnia 1939 h. zaklučany j padpisany ŭ Londanie abaronny sajuz.

Anhlija z Polščaj zabaviazvajucca pamahać adna druhoj, kali-b adna z ich apynułasia ŭ vajennaj baraćbie z pryčyny napadu z boku adnaje z eŭrapejskich vialikadziaržaŭ, abo kali-b adnoj ci druhoj paŭstała pahroza dziaržaŭnaj niezaležnaści, biezpasredna ci pasredna.

Kali-b pavodle hetaha dahavoru Anhlija z Polščaj apynulisia ŭ vajnie, dyk zabaviazvajucca niezaklučać paasobna mirnych dahavoraŭ z varožaj staranoj, chiba tolki ŭ parazumleńni adna z druhoj.

## Značeńnie anhielska-polskaha sajuzu

Zaklučeńnie j padpisańnie anhielska-polskaha sajuzu — heta paćvierdžańnie papiaredniaha miž imi abaronnaha dahavoru j śćvierdžańnie mnohich deklaracyjuŭ anhielskich adkaznych palitykaŭ — premjera Čemberlena j ministra zahraničnych spraŭ Halifaksa. Hetyja kiraŭniki anhielskaj palityki nie adnojčy ŭžo zajaŭlali, što Anhlija ŭ vypadku napadu Niamieččyny na Polšč, biezadkładna vystupić u abaronie niezaležnaści Polščy.

---

vi, chvaroby serca, vušaŭ, sustavaŭ i h. d.

Apača vyšej pakazanaha razvoju chvaroby može jana mieć dźvie inšyja formy: vospa *razliŭnaja j kryviatočnaja.*

*U razliŭnoj* formie nadta charakterna toje, što puzyrki, a potym i karosty nie lažać paasobna, a źlivajucca adny z adnymi, što ŭ budučyni pakinie pa sabie vahromnistyja rubcy na skury.

Druhaja forma *kryviatočnaja* —źjaŭlajecca, kali da karostaŭ vylivajecca kroŭ, karosty majuć tady kolar ciomna-sini, abo čorny.

Zmahańnie siańnia z vospaju niatrudnaje, majem na chvarobu mahutnaje aružža ŭ formie *pryščepaŭ.* Dziela vialikaje zaraznaści vospy, treba z kožnym padazronym chvorym zviarnucca da lekara, a to nat prosta da administracyjnych uładaŭ (palicyja), jakija majuć na ŭviecie zmahańnie miž inšym z zaraznymi chvarobami. Chvoraha biazumoŭna lepš addać da lakarni, asabliva kali heta dziaŭčyna, inakš taja pakul žyćcia budzie dakarać baćkom, što nie paškadavali jejnaje krasy dziavočaje, bo astanucca, kali j azdaravieje, na tvary rubcy. Pamieškańnie, dzie lažaŭ chvory, vopratku jahonuju, paściel i h. d. treba vydezynfekavać. Usich chatnich treba nanava pieraščapić, kali apošni pryščep byŭ užo kala 7-i hadoŭ nazad.

**Pryščep vospy.** Da pryščepu biarecca limfu z puzyrkoŭ vaśpianych ad ciałat, zaražanych vospaju ad ludziej. Karoviačaja vospa, pryščeplanaja ludziam, vystupaje ŭ ich tolki na miescy pryščepu, a nie raspaŭsiudžyvajecca pa całym ciele, jak heta byvaje zaŭsiody pry vospie naturalnaj. Čałaviek z pryščeplanuju vospaju, kali jana pryniałaś, budzie zabiaśpiečany na niekalki hadoŭ ad chvaroby. Potym robicca mienš adpornym i moža zachvareć. Dziela hetaha paŭtorny pryščep treba rabić paśla 5-7 hadoŭ.

Pryščeplać vospu možna tolki dzieciam zdarovym, jakija nia majuć harački, a na skury nia majuć badziulak ani skułaŭ. Na dzień pierad pryščepam treba dzicia vykupać i apranuć jaho ŭ čystuju saročku j vopratku. Pryščepy vospy abaviazujuć usich dziaciej da kanca I-ha hodu žyćcia. Paŭtorny pryščep robicca ŭsim dzieciam kala 7-ha hodu žyćcia. Tolki tym dzieciam nia treba rabić pryščepu, u jakich u apošnich paru hadoŭ było heta roblena j dzie vospa pryniałaś. Biazumoŭna ŭ dziaciej chvorych na niešta treba pryščep adkłaść na paźniejšuju paru.

Usiudy, dzie jość prymus pryščepaŭ, nichto z ludziej na henuju chvarobu nie chvareje.

**Inšyja pryščepy.** Apača pryščepu vospy medycyna siańnia viedaje šmat jakich inšych chvarobaŭ, pry jakich možna rabić pryščepy j dzie jany na daŭžej ci karaciej pamahajuć, zabiaspiečyvajučy ad mahčymaści zachvareńnia. Idealam medycyny jość imknieńnie da taho, pry ŭsich chvarobach znajści hetkija mahčymaści, kab možna było zabiaspiečycca ad chvaroby, a nia tolki jaje lekavać, kali jana schopić čałavieka. Siańnia daloka jašče da hetaha ideału, adnak viedajem užo pryščepy praciŭ *škarlatyny, dyfteryi,* adčaści *suchotaŭ i tyfusu.*

## Palityčnyja viestki

**Prapazycyi Niamieččyny dla Anhlii.** Kancl. Hitler zaprasiŭ da siabie anhielskaha ambasadara ŭ Niamieččynie, Hendersona j pieradaŭ jamu svaje prapazycyi dla Anhlii. Henderson biezadkładna vyjechaŭ u Londan i hetyja prapazycyi pieradaŭ anhielskamu ŭradu. Urad Anhli, paśla naradaŭ, daŭ svoj adkaz kancl. Hitleru praz ambasadara Hendersona, jaki 28 žniŭnia viernuŭsia ŭ Niamieččynu.

Jakija heta byli prapazycyi i jaki byŭ adkaz, — dakładna nia viedama. Ale nia vykiučajecca, što sprava jdzie ab sprobach vyrašeń nia sučasnaha palityčnaha sporu biez vajny.

**Sklikańnie anhielskaha parlamentu.** Paśla adjezdu z Londanu ambasadara Hendersona ŭ Niamieččynu, anhielski ŭrad sklikaŭ parlament. Nie zvažajučy, što ŭrad maje poŭnamoctva rašać ab spravach intaresaŭ Anhlii biez parlamentu, adnak premjer Čemberlen vyjaśniaje pradstaŭnikom narodu sučasnaje mižnarodnaje pałažeńnie j pałažeńnie Anhlii.

**Ci Hdansk padpalić Eŭropu?** Premjer francuskaha ŭradu Deladje 25 žniŭnia skazaŭ praz radyjo pramovu, u jakoj adznačyŭ, što Francyja ŭsimi siłami imkniecca, kab abaranić Eŭropu ad vajny. Pry hetym vyjaśniŭ, što sprava Hdansku łučycca z spravaj voli j žyćcia Polščy, a tak-ža j dolaj Francyi. Dziela hetaha — kazaŭ premjer Deladje — Francyja nia moža pakorycca nasielstvu j panavańniu niespraviadlivaści.

**Adstaŭka ŭradu ŭ Japonii.** Apošnimi dniami dasiulešni japonski ŭrad padaŭsia ŭ adstaŭku. Pryčyna hetaj adstaŭki — novy mižnarodny palityčny ŭkład, z pryčyny zaklučeńnia miž Niamieččynaj i S.S.S.R. paktu nieahresii. Novy japonski ŭrad maje być byccam demakratyčny.

**„Chryścijanskaja Dumka“ razam z miesiačnikam „ZORKA“ dla bieł. dziaciej kaštuje ŭ hod usiaho 3 zał. U składčynu jašče taniej: kali chto na adzin supolny adras žbiareć troch padpiščykaŭ, dyk za try ekzemplary „Chr. D.“ płacić tak-ža 3 zał., heta znača: kožny padpiščyk z hetaj trojki atrymaje našu hazetu za 1 zał. u hod. Numar konta 63.**

## Z niamiecka-polskaha pahraničča

**Hdanski pavadyr Niemcaŭ (gauleiter) — najvyšejšaja ŭłada ŭ Hdansku.** Nadoviačy ŭ Hdansku vydany kamunikat, što ad 23 žniŭnia siol. hdanski niamiecki pavadyr (gauleiter) Forster žjaŭlajecca najvyšejšaj uładaj u Hdansku.

**Aryšty ŭ Hdansku.** Hdanskija niamieckija ŭłady masava aryštoŭvajuć tamašnich Palakoŭ, nie padajučy navat pryčyny ich aryštu.

**Napady j zabojstvy.** Na polska-niamieckim pahraniččy, u vakolicach Dverski Most, 26 žniŭnia z niamieckaha boku byli abstrelenyja z kulamiotaŭ polskija hraničnyja stražniki. U vakolicach Dzvieźnia, 27 žniŭnia niamiecki konny artyleryst pierajechaŭ polskuju hranicu i ŭ strelaninie zabity na terytoryi Polščy. U Młaŭskim paviecie, na hranicy padčas słužby na starožy, 27 žniŭnia zabity adzin polski žaŭnier i adzin ranieny. Strely byli z niamieckaha boku.

Padobnyja vypadki na polska-niamieckaj hranicy vielmi častyja j paŭtarajucca kožny dzień.

## Roznyja viestki

**Novyja hrošy.** Polski Bank, u parazumleńni z ministerstvamSkarbu, 26 žniŭnia siol. vypuściŭ u abieh novyja hrošy — banknoty: 10 zł., 5 zł. i 2 zł. Hetyja banknoty (papierovyja hrošy) vypuščany z pryčyny niedachopu ŭ abiehu drobnych hrošaj. Novyja banknoty roŭnavartasny z sierabranymi manetami: 10 zł. 5 zł. i 2 zł. Adnačasna vypuščanyja drobnyja hrošy — bilon stalovy.

**Dekret ab parcelacyi dvaroŭ u pryhraničnaj pałasie.** Nadoviačy Prezydent Rečypaspalitaj vydaŭ dekret, jakim dazvalaje parcelavać dvary ŭ pryhraničnaj pałasie j tyja, što trymaje ŭ całaści zakon ab ziamielnaj reformie. Hetkija dvary, pavodle dekretu Prezydenta, u pryhraničnaj pałasie mohuć być rasparcelavanyja, kali hetaha patrabuje acharona hranicy, abo dziaržaŭnaja biaśpiečnaść. Ab parcelacyi takich dvaroŭ pastanaŭlaje administracyjnaja ŭłada.

Treba viedać, što na kuplu ziamli ŭ pryhraničnaj pałasie,treba mieć dazvoł administracyjnaj ułady.

**Adkład navuki ŭ škołach.** Navuka ŭ škołach, u całaj Polščy, mieła pačacca 4 vieraśnia. Zahadam ministra Aśviety hety termin pačatku navuki adklikany j adłožany da času specyjalnaha rasparadžeńnia ab vyznačeńni pačatku školnaha hodu.

## Apošnija viestki

**Niamieččyna j Anhlija.** Na zvarot kancl. Hitlera da anhielskaha ŭradu, ambasadar, Henderson pryvioz u Berlin adkaz, na jaki kancler Hitler praz ambasadara Anhlii, Hendersona vysłaŭ u Londan svoj adkaz. Anhielski ŭrad na hetaje piśmo kancl. Hitlera jšče nie adkazaŭ. Źmiest i charaktar hetaj zašyfravanaj pierapiski da publičnaha viedama nie padany.

**Eŭropa z strelbaj u rukach.** Anhlija z Francyjaj stajać u vajennaj pahatovie. Francyja j Anhlija zajaŭlajuć, što na ŭstupki nia jduć i trymajucca zaniataha stanovišča. U Prusach praviedziena ahulnaja mabilizacyja. Mabilizacyja pravodzicca i ŭ mnohich inšych eŭrapejskich dziaržavach. Niamieckaje vojska ŭvajšło ŭ Słavakiju. Słavacki ŭrad vydaŭ adozvu da narodu, kab spatykali niamieckaje vojska, jak abaroncaŭ Słavakii.

**Neŭtralnaść Danii j Litvy.** Niamieččyna abiacaje małym dziaržavam nienarušalnaść ichnich hranicaŭ. Hvarantuje tak ža nienarušalnaść Danii j Litvy, za ichniuju neŭtralnaść.

**Padhatoŭka da samaabarony ad nalotaŭ araplanaŭ u Polščy.** Cyvilnaje nasielnictva, pad kiraŭnictvam arhanizacyi samaabarony ad nalotaŭ araplanaŭ, u Varšavie j druhich haradoch kapaje ravy, dziela chavańnia ad napadaŭ araplanaŭ. U Vilni taksama kapajuć hetkija ravy.

**Haspadarčaja padhatoŭka da vajny.** Amal usie eŭrapejskija dziaržavy vydali vajenna-haspadarčyja rasparadžeńni.

Padpiska na „Chr. Dumku“: na hod—3 zał., na paŭhodu—1 zał. 50hr., na try miesiacy—1 zał. Cana asobnaha numaru — 10 hr.
Zahranicu padpiska ŭ dva razy darażej. — Adrys Redakcyi i Administracyi: Vilnia (Wilno), Zavalnaja vul. № 1—2.
Redaktor J. POŹNIAK
Рэдактар Я. ПАЗЬНЯК
Wydawca KS. AD. STANKIEWICZ
Выдавец КС. АД. СТАНКЕВІЧ
Drukarnia Białoruska im. Fr. Skaryny, Wilno, Zawalna 1. — Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная 1